

КЛІМАВІЦКАЯ ІНФА-ПАНАРАМА

№17(115)

1 снежня 2013 Клімавіцкі грамадска-палітычны бюлетэнь

КЛІМАВІЦКІ РАЁН АБВЕШЧАНЫ «ДРУГОЙ ЗОНАЙ ПАГРОЗЫ»

гэта робіцца ў сувязі з выяўленым у суседнім раёне Расіі ачагом АЧС

У Клімавіцкім раёне Магілёўскай вобласці прыняты ўзмоцненыя меры бяспекі ў сувязі з выяўленым у суседнім Шумяцкім раёне Смаленскай вобласці Расіі ачагом афрыканскай чумы свіней. Тут быў забіты дзік з вірусам АЧС, паведамляюць БелаПАН і Радыё Свабода.

Тэрыторыя Клімавіцкага раёна абвешчаная «другой зонай пагрозы»: пасля непрацяглага зацішша ад прыватных гаспадароў зноў патрабуюць, каб яны пазбыліся свойскіх свіней.

Райвыканкам прыняў спецыяльную пастанову. Што канкрэтна яна прадугледжвае, высветліць не ўдалося. Аднак, як вынікае з афіцыйных растлумачэнняў, на рынках раёна забараняецца прадаваць свіней і прадукты свінагадоўлі з прыватных гаспадарак. Нельга іх вывозіць і за межы раёна.

Супрацоўнікі ветэрынарнай службы абыходзяць прыватныя падворкі і папярэджваць пра недапушчальнасць гадоўлі свіней. Людзям выпісваюць прадпісанні з пазначэннем тэрміну, да якога яны павінны пазбыцца жывёлы.



«Усё прапісана ў 758-й пастанове Савета міністраў. У пяцікіламетровай зоне вакол свінагадоўчых аб'ектаў і комплексаў не павінна быць свіней ні ў насельніцтва, ні ў супрацоўнікаў», — тлумачыць галоўны ветэрынарны ўрач раёна Сяргей Зянько.

Прыватныя гаспадары кажуць, што зацішша з папярэджаннямі доўжылася каля двух месяцаў. Цяпер усё паўтараецца наноў, як у жніўні.

«Ужо два разы хадзілі, кажуць — чума набліжаецца, — дзеліцца адзін з вяскоўцаў. — Сказалі, каб да новага года свіней не было. Усіх разам жа не заб'еш — у некаторых два, тры парасяці, а то і больш. А ля нас недалёка дзяржаўныя свінакомплексы. Быў старшыня савета, дык сказаў: «Цяпер курэй купляйце».


У вёсках з неахвотай падпарадкоўваюцца патрабаванням кантралёраў. Лічаць, што хваля запалохванняў зноў мінецца і наступіць зацішша. Адно з такіх меркаванняў: «Сказалі, што будуць хадзіць правяраць і штрафы даваць, але так гэта ці не — хто яго ведае. Нас во папярэдзілі ў жніўні, мы ўзялі ды і забілі. А некаторыя людзі не забілі — і слушна зрабілі. Хоць салам пачаставаліся, а мы толькі шкуркі ядзім. Цяпер жа кароў мала хто трымае. У нас у вёсцы дзесяць кароў усяго, і ад іх пазбаўляюцца».

Ёсць сярод вяскоўцаў і тыя, хто з разуменнем ставіцца да ўзмацнення мераў бяспекі, аднак і яны прызнаюць, што даводзіцца праз сілу падпарадкоўвацца. Спадзяюцца, што некалі сітуацыя зменіцца да лепшага. «Разумеюць людзі, вядома ж. Розумам разумеюць, а вось сэрцам — не. Калі б Вы былі на месцы гэтага селяніна, які трымае парсюка, у якога дужа малы заробак ці пенсія, і пазбавіць яго гэтага свінча — ці задаволеныя людзі будуць, як вы думаеце? І дзецям жа даводзіцца дапамагаць: без дапамогі бацькоў-пенсіянераў дзеці ж ня змогуць працягнуць як трэба», — разважае жыхар аднае з вёсак Клімавіцкага раёну.

Вяскоўцаў у Клімавіцкім раёне пакуль не штрафуюць за свіней. У сельсаветах сцвярджаюць, што людзі з разуменнем ставяцца да патрабаванняў улады. Тым не менш, незадаволенасць існуе. Супрацоўніца аднаго з сельсаветаў кажа:

«Некаторыя абураюцца, але ў той жа час разумеюць. Кажуць, што не цяпер заб'юць, дык пазней. Напрыклад, у гаспадарцы свінні ёсць, і дзеці ж — пяцьшэсць. Гэта ж асноўная для сям'і спажыва. А так — даводзіцца забіваць. Многія ўжо забіваюць кароў, гусей, курэй, каб хоць мяса якое было. Да 1 студзеня не павінна быць свіней».

За апошнія паўгода ў Смаленскай вобласці Расіі зарэгістраваны 21 выпадак афрыканскай чумы свіней. Інфекцыю выяўлялі і ў дзікоў, і ў свойскіх свіней. На тэрыторыі пяці гаспадарак накладзены каранцін, сярод іх — акцыянернае таварыства «Заімка» Шумяцкага раёна.




ВЛАДИМИРА КРАВЦОВА ПЕРЕБРОСИЛИ НА ГРОДНЕНЩИНУ

Теперь у нас будет не только депутат, но и «маленький президент»

Александр ВЛАД

Середина ноября ознаменовалась важным для нашего региона событием. Лукашенко назначил Владимира Кравцова председателем Гродненского облисполкома. Для тех, кто не в курсе — Владимир Кравцов представляет в парламенте население Кричевского избирательного округа №83 (Климовичский, Кричевский и Хотимский районы). Возникает вопрос, останется ли теперь у избирателей округа свой депутат?



Думается, что и для самого Лукашенко принятые им кадровые решения были достаточно неожиданными. Все видели, как под влиянием эмоционального всплеска он в один миг отправил в отставку Бориса Батуру, больше трёх лет возглавлявшего Минский облисполком. Наговорив ему напоследок неприятных слов, Лукашенко чуть позже понял, что найти равноценную замену не так-то просто. На скамейке запасных подходящих кандидатур не наблюдалось, а отдать столичную область случайному человеку было бы непростительной ошибкой. Тем более, что через полтора года президентские выборы, исход которых решается в Минске и только в Минске.

Именно этим обстоятельством, скорее всего, объясняется назначение на должность Семёна Шапиро, работавшего председателем Гродненского облисполкома. Он показал и доказал свою лояльность президенту, слыл неплохим хозяйственником, уже успел поруководить Министерством сельского хозяйства. Так что преемником Батуры он стал практически без вариантов.

А вот загадка, почему в Гродно в срочном порядке перебросили депутата Кравцова, оставляет место для небольших аппаратных интриг. Назначая новых руководителей областей, Лукашенко заявил: «Это нормально, когда идёт ротация кадров». Но вряд ли 60-летний Владимир Кравцов, удобно усевшийся в депутатском кресле, рассчитывал на какую-либо ротацию. Впереди у него были несколько лет в тихой парламентской заводи, солидная пенсия и почётная старость. И вдруг как снег на голову свалилось неожиданное назначение, сулившее ему немало хлопот.

Видимо, чувствуя внутреннее смятение своих назначенцев, Лукашенко по-своему пытался их ободрить: «Запомните, я всегда говорил (может и через край вы пользуетесь этим): вы — маленькие президенты на своей территории. Вы, как президент, отвечаете за эту землю, вам даны громадные права. Никаких компартий и партий у вас нет, какие вам мешают, или путаются под ногами. Действуйте!». Семён Шапиро и Владимир Кравцов не возражали. Да и что, собственно говоря, они могли сказать? Сомневаться в высочайшем доверии у нас не принято.

КСТАТИ:

Как сообщают СМИ, после своего назначения Владимир Кравцов отметил, что законодательство позволяет ему, являясь председателем облисполкома, продолжать оставаться депутатом и участвовать в заседаниях парламента. Но если обратиться к Закону «О статусе депутата Палаты представителей, члена Совета Республики Национального собрания РБ», то можно узнать следующее. Согласно статье 6 данного Закона депутат Палаты представителей не вправе «занимать другие государственные должности, за исключением случаев, предусмотренных Конституцией РБ, иными законодательными актами».

ПРЫЗНАЧАНЫЯ СТАРШЫНЯМІ ВЫКАНКАМАЎ ДЭПУТАТЫ ПРАЦЯГВАЮЦЬ ЗАЙМАЦЬ ДЗВЕ ПАСАДЫ

Зміцер ЛУКАШУК, Еўрарадыё

Гэта супярэчыць закону, але прызначаць выбары новых парламентарыяў ЦВК не можа, пакуль “старых” не пазбавілі дэпутацкіх паўнамоцтваў.

І калі гэта можа здарыцца, старшыня Цэнтрвыбаркама Лідзія Ярмошына не ведае. Вось як яна пракаментавала сітуацыю Еўрарадыё:

“Іх паўнамоцтвы не спыняюцца аўтаматычна (адразу пасля прызначэння на іншую пасаду — Еўрарадыё) — павінна прымаць рашэнне Палата прадстаўнікоў. І пакуль такое рашэнне не прынятае, мы не можам разглядаць пытанне правядзення выбараў. Мы ж не ведаем — прымуць дэпутаты такое рашэнне на гэтай сесіі ці на веснавой”.

Паводле закона “Аб дэпутатах”, народны абраннік можа працаваць выключна на пасадзе парламентарыя. У выпадку абрання ён павінен звольніцца з ранейшага месца працы, у выніку прызначэння на пасаду падчас свайго дэпутацтва — мусіць скласці дэпутацкія паўнамоцтвы. Але па словах Лідзіі Ярмошынай, у законе не прапісана, цягам якога часу Палата прадстаўнікоў павінна прыняць рашэнне аб пазбаўленні былога калегі паўнамоцтваў.



Нагадаем, днямі кіраўнік краіны прызначыў дэпутата Аляксандра Зазулю старшынёй Кобрынскага райвыканкама, а яго калегу Уладзіміра Краўцова — старшынёй Гродзенскага аблвыканкама. Такім чынам, фактычна без сваіх прадстаўнікоў у парламенце засталіся выбарцы Кобрынскай акругі № 12 і Крычаўскай акругі № 83.

Дарэчы, да гэтага часу не маюць свайго дэпутата выбарцы Навабеліцкай выбарчай акругі — там дэпутата не здолелі абраць падчас парламенцкіх выбараў 2012 года. Такім чынам, сёння у парламенце замест 110 дэпутатаў фактычна працуе 107 — аднаго няма ад пачатку, двое зараз занятыя больш важнымі справамі на новым месцы працы.



«ВСЁ ЗАКРЫВАЙТЕ, А ЛЮДЕЙ НА ЛУНУ ОТПРАВЬТЕ»

Михаил ПЕТРОВ

Год бережливости в нашей стране скорыми темпами превращается в Год всеобщей экономии. Сокращения работников затронули почти все отрасли народного хозяйства. Чиновники, педагоги, библиотекари уже испытали на себе 20-25-процентное сокращение коллективов и организаций. Следующие на очереди — сотрудники «Белпочты». А вслед за ними проблемы, связанные с ликвидацией почтовых отделений и увольнением почтальонов, испытает на своей шкуре всё остальное население.

В ноябре стало известно, что в Климовичском районе собираются упразднить сразу девять сельских почтовых отделений. В районной газете это преподносится как «целенаправленная работа по модернизации почтовой связи, переходу части объектов на новые технологии предоставления почтовых услуг». Уже до конца года на селе будут закрыты девять стационарных отделений почтовой связи — Галичское, Гусарковское, Киселевобудское, Макеевичское, Осмоловичское, Павловичское, Стародединское, Судиловское, Хотовижское.

Заниматься обслуживанием населения теперь станут передвижные отделения почтовой связи и моторизированная доставка почты. Говоря проще, сейчас люди будут приходить за газетами или пенсией не на деревенскую почту, а в определённое время к машине. А там где можно, чтобы сэкономить на бензине, в пешеходный путь отправят сельских почтальонов. Районный узел связи обещает разработать схему маршрутов автопочты с учётом мнения местных жителей. Как пишет районка, «будет изучен спрос населения, учитываться пожелания людей в каждом конкретном населённом пункте».

В связи с этим отметим, что журналист Алесь Асипцов из информационной кампании БелаПАН уже уточнил у климовичских сельчан, что они думают о закрытии почтовых отделений. Выяснилось, что сельское население Климовичского района не согласно с упразднением отделений и заменой их на передвижную доставку.

Например, в деревне Галичи жители провели собрание, чтобы защитить свою почту. Как передаёт об этом БелаПАН, по словам жительницы деревни Галичи: «Собрание было, все люди на нём кричали. Говорили, что закрывайте уже и этот магазин последний. Всё закрывайте. А людей на Луну отправьте. Все подписались против и письмо отправили в райисполком. Говорили, что нас якобы будет обслуживать почтальон, а будет ли он — неизвестно. Вот положить деньги на мобильник или коммунальные заплатить, так стой на улице зимой».

Сегодня в Галичах живёт более двухсот человек, почти половина из них — пенсионеры. Сельчане просят помочь им отстоять почту: «Что она нам даёт? Пенсию почта выдаёт. Привозят продукты более дешевые, чем в магазине. Нам же нужно и за телефон платить, и за радио. И где мы будем сейчас пенсию получать? Когда та машина придёт? Стой на перекрёстке, жди её. Что нам делать? Помогите».

Такое же отношение к закрытию почты в деревне Старый Дедин, где также живёт более двухсот человек. «Я вот не понимаю, какие у них здесь затраты, — рассказала одна из сельчанок. — Начальник почты тут и убирала, и отапливала. Затраты только в том, что ей платили зарплату. Но всё равно машина с трассы на пять километров сворачивает к нашей деревне».

В Климовичском районном узле связи журналиста БелаПАН заверили, что обслуживать в передвижных почтовых отделениях будут не хуже, чем в стационарных. Выбор услуг останется тот же. Вместе с тем признают, что закрытие почты сельчане воспринимают негативно. «Они привыкли, что почтовые отделения — это место для встреч, для разговоров, — указывает сотрудница узла связи. — Но с экономической точки зрения содержать для этих целей отделения сегодня не рентабельно».

Всего в Беларуси собираются закрыть в этом году более двухсот сельских почтовых отделений. Люди не соглашаются с закрытием и, как могут, протестуют. Но ухудшающееся экономическое положение диктует свои жёсткие условия.

НОВОСТИ РЕГИОНА

РУБЯТ И ПРОДАЮТ

Сайт облисполкома информирует, что «Климовичский лесхоз» выполнил задание по заготовке и экспорту древесины более чем на 1 млн. долларов. Валюты в стране катастрофически не хватает, так что вырубка климовичских лесов ощутимо пополняет казну. Пока есть где размахнуться топором, ведь в общей площади лесхоза (около 88 тыс. гектаров) покрытые лесом земли составляют 76 тыс. гектаров. Но с такими размахами по заготовке древесины поневоле запоёшь: «Не рубите, мужики, не рубите!»


НАШ МЕТР ДОРОЖЕ

«Могилёвская правда» обратилась к теме доступности жилья в области. Газетой был поставлен вопрос, есть ли резервы для снижения стоимости жилого «квадрата»? Ответ на него дала начальник отдела областного КГК Людмила Непапушева: «При недавнем нормативе 4,6 миллиона рублей средняя его стоимость в домах, строящихся с господдержкой, составляла 4,9 миллиона. В Могилёве в сентябре она была на уровне 4,7 миллиона рублей, в Климовичском районе — 7,4 миллиона». Получается, дешевле построить жильё в Могилёве, чем в Климовичах?



ПРИГОВОР НАСИЛЬНИКУ

О совершении этого ужасного преступления сообщалось несколько месяцев назад. В конце весны в Климовичах был задержан 20-летний местный житель по подозрению в изнасиловании и попытке убийства 12-летней сестры. Задержанного отправили проходить экспертизу, чтобы определить его психическое состояние. По результатам комплексной судебной экспертизы он был признан вменяемым. Судебная коллегия Могилёвского областного суда приговорила насильника к 15 годам лишения свободы с отбыванием наказания в колонии усиленного режима.



АФРИКАНСКАЯ ЧУМА ИДЁТ В КЛИМОВИЧИ ИЗ РОССИИ?

Данила МЕСТИЧ

Пугающую аббревиатуру АЧС знает уже в Беларуси и стар и млад. Наверное, трудно найти человека, который не слышал бы про африканскую чуму свиней. Но многие ли из белорусов задумываются над тем, что действительная опасность по распространению этого вируса грозит нашей стране не из далёкой Африки, а из близкой России? Есть все основания считать подобную угрозу всё более и более реальной.



В Климовичском районе население, как и везде, в обязательном порядке просвещали на тему АЧС. В районной газете печатались статьи и разъяснительные материалы. По частным подворьям периодически проводился обход представителей санитарно-ветеринарных служб. А в повестку единого дня информирования в августе 2013-го для членов информационно-пропагандистских групп был включён вопрос: «Африканская чума свиней: профилактика и меры борьбы».

Не подвергая сомнению все эти мероприятия, укажем лишь на одно слабое место в их реализации. И в Климовичском районе и в остальных регионах страны людей просто ставили в известность, доводя до их сведения официальную и строго дозированную информацию. Масштабы гласности, разрешённые государством, были строго ограничены. В результате возникла противоречивая ситуация. С одной стороны, чиновники строго контролировали любые сведения о свиной чуме, мотивируя это тем, что они не могут допустить распространения слухов и недостоверных фактов. Но с другой стороны, такая информационная закрытость сама по себе порождала питательную среду для появления всевозможных домыслов о чуме в Беларуси. Поэтому закономерно, что белорусские граждане больше верили тому, что узнавали про АЧС в разговорах, чем из государственных СМИ. Тем более, что официальные источники освещали эту важную и злободневную тему, можно сказать, вынужденно.

Вот как это выглядит в действительности. В субботу 23 ноября в районной газете «Родная ніва» напечатали заметку «Обсуждены актуальные вопросы». Речь в ней шла о том, что на Климовщине прошёл очередной Единый день информирования населения. Климовчанам представили типичный набор официозных новостей. Сообщалось о визите чиновницы облисполкома, криминогенной обстановке и т. п. Ничего особенного, но один абзац, в самом деле, представлял собой «актуальный вопрос». Он заслуживает того, чтобы привести его полностью:

«На встрече с работниками центральной районной больницы прокурор района Александр Земляков подчеркнул, что 11 ноября 2013 года районным исполнительным комитетом принято решение № 24-35, в котором территория Климовичского района признана второй угрожаемой зоной. Это связано с тем, что в соседнем Шумячском районе был зарегистрирован случай заболевания африканской чумой свиней. В личных подсобных хозяйствах граждан в скором времени не должно остаться свиней».

Далее в тексте говорилось о пожарах и необходимости контроля за отопительным оборудованием, но вряд ли читатели «Роднай нівы» пробежали заметку глазами до конца. Подумать только, ведь уже почти забытая чума неожиданно оказалась практически под боком расслабившихся климовчан! Людей можно понять, так как в последнее время им почти перестали напоминать про возможность распространения АЧС в Беларуси. Да и в данном конкретном случае актуальная информация прозвучала со значительным опозданием. Райисполком принимает решение 11-го числа и лишь 23-го о нём упоминается (!) на страницах местной районки. Почему бы не напечатать его полностью, всё-таки не каждый день у нас объявляют «угрожаемую зону»?

Легко понять, почему в Климовичах озаботились происшествием в российских Шумячах. Диким кабанам прописка не нужна, они ходят по обе стороны границы. А поголовье свинокомплекса «Сосны» при Климовичском КХП насчитывает более 20000 свиней. Так что проникновение чумы может привести к сокрушительным последствиям для предприятия. Но вот что интересно в данной ситуации. Россельхознадзор официально сообщил о выявлении инфицированного возбудителем АЧС дикого кабана в Шумячском районе 25 октября 2013 г., а 11 ноября райисполкомом принимается решение № 24-35. Всё вроде бы логично и правильно.

Несколько иначе начинаешь оценивать ситуацию, когда узнаёшь подробности о происходящем в Смоленской области. Российские источники, ссылаясь на пресс-службу Россельхознадзора, передают про 21 случай АЧС, зарегистрированный на сопредельной с нами Смоленщине с июня по ноябрь 2013 года. Поневоле возникает вопрос, а не затянули ли в Климовичах с введением «зоны»? Сейчас, после непродолжительного затишья, от хозяев частных подворий снова требуют, чтобы они избавились от свиней. Журналист БелаПАН Алесь Асипцов пообщался с одним из деревенских жителей: «Уже два раза ходили, говорят — чума приближается. Сказали, чтобы до нового года свиней не было. Всех сразу же не убьёшь — у некоторых двое, трое поросят, а то и больше. А от нас недалеко государственные свинокомплексы. Был председатель совета, так сказал: «Теперь кур покупайте».

Теперь в Климовичском районе принимают усиленные меры безопасности. При этом информационная блокада соблюдается в прежнем режиме. Людям сообщают только то, что разрешают узнать местные и вышестоящие власти. Неизвестна хоть какая-нибудь конкретика даже про решение Климовичского райисполкома: «Что конкретно оно предусматривает, выяснить не удалось» (БелаПАН). Зачем это скрывать, непонятно. И, главное, почему это скрывают от жителей района, ставшего «угрожаемой зоной»?



БАНКИ ИЗМЕНИЛИ УСЛОВИЯ ПО ЖИЛИЩНЫМ КРЕДИТАМ

чтобы построить квартиру, нужно получать от... 50 млн в месяц

Кредиты на недвижимость становятся всё более недоступными. FINANCE.TUT.BY сообщает об этом с цифрами на руках.

Деньги на покупку жилья сегодня не выдаёт уже ни один банк. Последним 13 ноября от этого отказался Франсабанк. Построиться в долг можно лишь с Беларусбанком и Белагропромбанком. Но и там условия ужесточились.

Ещё недавно у госбанков была одинаковая процентная ставка по жилищным кредитам — 38,5% годовых (СР+15 п.п.). Но 20 ноября кредиты от Белагропромбанка подорожали сразу на 6,5 процентного пункта – до 45% годовых (СР+21,5 п.п.).

Кроме того, оба банка ещё в конце октября изменили свои подходы к расчёту максимальной суммы кредита. Теперь она выводится не из совокупного дохода семьи, а лишь от чистого дохода одного заявителя.

Что получается. Например, я хочу построить квартиру за 50 тысяч долларов (475 миллионов рублей). В Белагропромбанке мне готовы профинансировать до 90% стоимости будущего жилья. В моем случае это 427,5 миллиона. Чтобы получить эти деньги на максимально возможные 20 лет, мой ежемесячный доход должен составлять почти 70 миллионов.

В Беларусбанке готовы одолжить денег на 75% стоимости квартиры на 15 лет. Если я хочу взять максимально возможные для меня 360 миллионов, то моя зарплата должна составлять около 55 миллионов в месяц.

Чтобы застраховать свои риски, банк оценивает финансовые возможности заявителя. Так, при средней зарплате по стране на уровне 6 миллионов в месяц, в Белагропромбанке можно рассчитывать лишь на заем в 35,5 миллиона на 20 лет. В Беларусбанке максимальная сумма кредита составит 39,5 миллиона на 15 лет.



КВАТЭРЫ, НЕ ПРЫВАТЫЗАВАНЫЯ ДА 1 ЛІПЕНЯ 2016-ГА, СТАНУЦЬ АРЭНДНЫМІ

Еўрарадыё паведамляе, што Урад падрыхтаваў праект указа "Аб некаторых пытаннях прававога ўрэгулявання жыллёвых адносін".

26 лістапада Аляксандр Лукашэнка абмеркаваў указ з кіраўніком Адміністрацыі прэзідэнта Андрэем Кабяковым, віцэ–прэм'ерам Анатолем Калініным, старшынёй Мінгарвыканкама Мікалаем Ладуцькам і міністрам жыллёва-камунальнай гаспадаркі Андрэем Шорцам. Па словах Лукашэнкі, указ уносіць сур'ёзныя змены ў жыллёвую палітыку.

Лукашэнка: "Па сутнасці, прапануецца новы падыход да фармавання фонду арэнднага жылля. Па-першае, што тычыцца стварэння фонду арэнднага жылля, да 1 красавіка 2014 года плануецца перавесці ў яго ўсе заселеныя службовыя і спецыяльныя жылыя памяшканні. А пасля 1 ліпеня 2016 года — уключыць у гэты фонд і непрыватызаваныя на гэтую дату грамадзянамі дзяржаўныя кватэры. Не прыватызавалі — значыць, яно застаецца дзяржаўным, і мы яго робім арэндным".

На цяперашні час у Беларусі каля 330 тысяч непрыватызаваных кватэраў.


НОВОСТИ РЕГИОНА

СИЛА В КОРНЕ

Несколько лет назад в ОАО «Новая Друть» Белыничского района соорудили парник, чтобы выращивать экзотическое растение — женьшень. Потребовалось создать условия, близкие к естественной среде обитания золотого корня, растущего в тайге. И вот белыничский женьшень впервые дал семена, сообщила на днях газета «Рэспубліка». Это даёт надежду на расширение плантаций целебного растения. А Климовичский ЛВЗ уже сейчас готов закупать его для создания новых фирменных напитков.

А НУ-КА, ДЕВУШКИ!

В ноябре в Климовичах состоялся районный этап конкурса научных биолого-экологических работ среди учащихся. Работы к конкурсу готовились в трёх номинациях: «Общая экология», «Экология растений» и «Экспериментальная и сельскохозяйственная биология». После подведения итогов было объявлено, что победителями стали 10 учащихся, которые получили дипломы районного отдела образования, спорта и туризма. Нельзя не заметить, что это были 10 девочек. Мальчики глупее или просто ленятся?



ШАХМАТНЫ КАМПАЗІТАР УЛАДЗІМІР ТРАЯНОЎСКІ

Сяржук **АРЖАНЦАЎ**

Пра палескі горад Лунінец чулі не толькі жыхары Беларусі, але і некаторыя аматары шахматнай гульні з іншых краін. Яны ведаюць лунінецкі часопіс «Альбино», які змяшчае самую розную інфармацыю на тэму шахматнай кампазіцыі — ад гісторыі да сучаснасці. Сёлета ў № 105 часопіса з'явіўся матэрыял «Проблемист Вл. Трояновский», прысвечаны клімаўчаніну Уладзіміру Ільічу Траяноўскаму. У свой час ён быў знакамітым стваральнікам шахматных задач, у чым дасягнуў выдатных вынікаў. Прапануем нашым чытачам біяграфічны нарыс, падрыхтаваны для «Альбино» Вольфам Рубінчыкам (Мінск) з дапамогай дачкі Траяноўскага Валянціны Белакур (Клімавічы). Друкуецца ў скарачэнні.

ТРАЯНОЎСКІ УЛАДЗІМІР ІЛЬІЧ нарадзіўся 22 лістапада 1924 года ў Гомелі. У 1956 годзе скончыў Крычаўскае педагагічнае вучылішча. З 1944 па 1949 гг. працаваў на пасадзе загадчыка нафтабазы Клімавіцкай МТС. З 1949 года прыняты на Клімавіцкае прадпрыемства электрасетак (ПЭС) на пасаду загадчыка складам. З 1958 года прызначаны начальнікам забеспячэння, з 1973 года пераведзены старшым эканамістам аддзела забеспячэння. З 1 лістапада 1985 года знаходзіўся на пенсіі. За працоўную дзейнасць атрымаў шэраг узнагарод і ганаровых адзнак, у тым ліку медаль "За доблесную працу" і нагрудны знак "Ветэран энергетыкі БССР". Памёр 1 верасня 1999 года ў Клімавічах.

Пачаў займацца шахматамі яшчэ да вайны, першаразраднік па шахматнай кампазіцыі. Усяго апублікаваў каля 200 шахматных задач. На розных конкурсах і спаборніцтвах былі адзначаны 36 шахматных кампазіцый Уладзіміра Траяноўскага, а 8 з іх атрымалі першае месца. Фіналіст IV і V асабістага першынства СССР па шахматнай кампазіцыі ў раздзеле двух і трохходовак. Уваходзіў у зборную Беларусі ў камандных першынствах СССР па шахматнай кампазіцыі.

Творчасцю шахматнага кампазітара У.І. Траяноўскага цікавяцца і сёння. Найлепшыя ягоныя задачы прадстаўлены ў зборніках «Шахматная композиция в Белоруссии» (Мінск, 1981 год) і «Поэзия шахмат Беларуси» (Ліда, 2004 год). А чытачы нашага выдання могуць паспрабаваць адшукаць рашэнне наступных задач Траяноўскага, якія не ўвайшлі ў згаданыя зборнікі. У абодвух выпадках — мат у 2 хода.

**** 1) «Звязда» - 01.02.1949 год***
Б. Крh1, Фh2, Лd2, Лf4, Сa1, Сa2, Kd8, Ke6, пп: f7, g2, g5 (11)
Ч: Крe5, Лc3, Лc4, Cd3, Cf8, пе7 (6)
Рашэнне: 1. g4!


**** 2) «Звязда» - 08.05.1949 год***
Б. Крh4, Фb5, Лa3, Лf3, Сe5, Cg8, Kb6, Kd7, пп: d6, g2 (10)
Ч: Крe4, Лd2, Сc5, Kb3, Ke6, пп: d5, f2, f5 (8)
Рашэнне: 1. Cb2!

ДАРЭЧЫ:
Матэрыял у часопісе «Альбино», прысвечаны Уладзіміру Траяноўскаму, складаецца з артыкула, 3 фатаграфій кампазітара і 12 дыяграм з задачамі Траяноўскага. Пры жаданні адшукаць гэты нумар можна ў інтэрнэце па адрасу albino-by.narod.ru. Там знаходзіцца архіў большасці выпускаў часопіса ў фармаце PDF.

ВЫБІТНЫЯ ШАХМАТНЫЯ КАМПАЗІТАРЫ БЕЛАРУСІ




Уладзімір Траяноўскі
1924–1999



Конкурс клуба «Пежо» (Францыя), 1962.
1-ы ганаровы водгук. Мат за 2 хады.








ЯК ПАМІРАЛІ ДЫКТАТАРЫ?

Незалежны тэлеканал Белсат падрыхтаваў некалькі прыкладаў па тэме “Як паміралі дыктатары?”. Тыя, каму пашанцавала, — на самоце. Іншыя — паміралі ў турме ад разрыву сэрца. Былі і тыя, каго разадралі на кавалкі звар’яцелыя ад нянавісці змагары з дыктатарскім рэжымам.



Спакойная смерць аўтара іспанскага халакосту

38 гадоў таму памёр іспанскі дыктатар Франсіска Франка. Ён прыйшоў да ўлады на хвалі грамадзянскай вайны ў 1936 г. У тым жа годзе Франка ачоліў нацыяналістычную прафашысцкую хунту і захапіў уладу ў Іспаніі на 39 гадоў, аж да свайго скону 20 лістапада 1975 г. Адзін з нешматлікіх дыктатараў, які памёр сваёй смерцю. Дакладнай лічбы ахвяраў палітычных рэпрэсіяў Франка не называюць, але згодна з некаторымі звесткамі, ад рук рэпрэсіўнага апарату Франка ў гады Грамадзянскай вайны (1936–1939) і ў мірны час маглі загінуць да 200 000 чалавек. Ахвярамі тэрору былі ідэалагічныя праціўнікі дыктатара, сярод якіх анархісты, сацыялісты і камуністы.

Перадапошні дыктатар Еўропы памёр у Гаазе

Былы прэзідэнт Югаславіі Слабадан Мілошэвіч памёр у турэмнай камеры Гаагскага трыбуналу. Першапачаткова высоўваліся версіі самагубства югаслаўскага ката, але судмедэкспертыза не знайшла пацверджання гэтай версіі. У 1999 г. (падчас канфлікту ў Косава) Мілошэвіч быў абвінавачаны ААН і НАТО ў ваенных злачынствах, парушэнні Жэнеўскай канвенцыі ды генацыдзе.

Так і не адседзеў сваіх пажыццёвых зняволенняў

Аргенцінскі дыктатар Хорхэ Рафаэль Відэля памёр ва ўзросце 87 гадоў ад сардэчнага прыступу ў турме, дзе ён адбываў пакаранне — некалькі пажыццёвых зняволенняў. Ён кіраваў Аргенцінаю ў перыяд так званай Бруднай вайны, а пазней быў прыцягнуты да крымінальнай адказнасці ды асуджаны на розныя тэрміны турэмнага зняволення за злачынствы супраць чалавецтва, учыненыя ваенную хунтаю ў 1970–1980-я гг.

Смерць у шпіталі

У чылійскага дыктатара Аўгуста Піначэта таксама не вытрымала сэрца. Ён памёр у шпіталі ў асяроддзі сваёй сям’і. Пасля таго, як стала вядома пра смерць Піначэта, на вуліцы Сант’яга выйшлі тысячы праціўнікаў ягонага кіравання. Для разгону натоўпу, які святкаваў смерць эксдыктатара, былі ўжытыя вадамёты і слезацечны газ. Чылійскі дыктатар прыйшоў да ўлады ў выніку вайсковага перавароту ў 1973 г., зрынуўшы прэзідэнта Сальвадора Аллендэ. За 17 гадоў кіравання Піначэта ў Чылі больш за 3000 чалавек былі забітыя ці зніклі без вестак.

Агонія, параліч і выгнанне з Маўзалею Леніна

Савецкі дыктатар Сталін памёр у агоніі на лецішчы. Паводле адной з версіяў, Іосіфа Вісарыёнавіча атруцілі ягоны паплечнік у тэроры Лаўрэнцій Берыя. Ёсць меркаванні гісторыкаў, што да смерці Сталіна мог спрычыніцца і ягоны наступнік Мікіта Хрушчоў. Спачатку забальзамаванае цела Сталіна было змешчанае ў Маўзалеі Леніна, але 30 кастрычніка 1961 г. XXII з’езд КПСС пастанавіў, што «сур’ёзныя парушэнні Сталінам ленінскіх запаветаў... робяць немагчымым пакіданне труны з ягоным целам у Маўзалеі».

Тры гадзіны катаванняў і гвалту. Смерць стала збавеннем

Лідара лівійскай Джамахірыі Муамара Кадафі перад смерцю некалькі гадзінаў катавалі. Захопленага паўстанцамі 69-гадовага дыктатара, параненага і акрываўленага, зґвалцілі палкаю або нажом. Некалькі дзён цела Кадафі ляжала ў лядоўні, а на мёртвага дыктатара прыходзілі паглядзець, як у цырк. Пасля яго разам з сынам таемна пахавалі. Паводле некаторых версіяў, цела спалілі. Кадафі зрынулі ў выніку грамадзянскай вайны ў Лівіі, якая пачалася пасля змены рэжымаў у суседніх Тунісе і Егіпце.

ЛУКАШЭНКА: Я — НЕ ДЫКТАТАР, ГЭТА СТО ПРАЦЭНТАЎ

У 2012 годзе ў інтэрв’ю брытанскай газеце «Індэпэндэнт» і тэлеканалу Бі-бі-сі Аляксандр Лукашэнка адхіліў абвінавачанні ў дыктатарстве на свой адрас. «Тое, што я не дыктатар, — гэта сто працэнтаў так, бо гэта супярэчыць наогул маёй сутнасці. Я дэмакрат большы, чым вы, нават у вашым разуменні гэтага працэсу і гэтага слова. Я свабоду чалавека цаню вышэй за ўсё».

«…Часам даводзіцца прымаць жорсткія рашэнні. І вы кажаце: „Гэта дыктатура“. Ды няма ў мяне рэсурсу для дыктатуры, вы разумееце? Рэсурсу няма!». Паводле яго слоў, «нават Расія сабе дыктатуру дазволіць не можа». «У мяне няма прыроднага газу, нафты, ядзернай зброі і іншага. Пра што вы кажаце? Калі б толькі я адважыўся сёння дзейнічаць як дыктатар, „есці“ людзей на вуліцах, вешаць іх ці яшчэ нешта падобнае, ды мяне проста, і правільна зрабілі б, мяне б знеслі! І нават не нашы людзі, мяне б знішчылі вось гэтыя дэмакраты, якія размешчаны на захад ад Брэста! І правільна б зрабілі», — заявіў Лукашэнка.





ДЛЯ СЕМЕЙНЫХ ДЕБОШИРОВ У МИЛИЦИИ ЕСТЬ СЮРПРИЗ

Вячеслав БУДКЕВИЧ, naviny.by

Белорусская милиция получила реальный инструмент для привлечения к ответственности семейных скандалистов.

Как сообщил на пресс-конференции 22 ноября заместитель начальника управления профилактики МВД Сергей Красуцкий, с начала года в стране несколько уменьшилось количество задокументированных милицией административных правонарушений в сфере семейно-бытовых отношений — на 3,2%.

«Это объективное снижение, поскольку при выездах на семейно-бытовые конфликты ранее составлялись протоколы по ст. 17.1 КоАП (мелкое хулиганство). Суды в последнее время либо прекращали такие дела, либо вообще не принимали к рассмотрению, поскольку не было основного квалифицирующего признака — нарушения общественного порядка», — сказал Красуцкий.

На сегодня, по его словам, проблема решена: в КоАП внесена поправка, статья 9.1 дополнена второй частью, которая предусматривает административную ответственность «за нанесение побоев, не повлекших телесных повреждений, умышленное причинение боли, физических и психических страданий, совершенных в отношении близкого родственника либо члена семьи».

«Это специализированная статья, которая применятся нами при выездах на семейно-бытовые конфликты», — подчеркнул представитель МВД. По его информации, с момента вступления в силу данной поправки (28 августа 2013 года) судами вынесено уже 548 решений — правонарушители привлечены к административной ответственности.

«В ближайшей перспективе мы будем эту статью очень активно использовать, учитывая реальный рычаг воздействия на правонарушителя», — заявил Красуцкий.

БРАТ ЭКС-ПРЕЗИДЕНТА КИРГИЗИИ БАКИЕВА ПРИГОВОРЕН К ПОЖИЗНЕННОМУ СРОКУ

Юлия ОРЛОВА, РИА Новости

Младший брат экс-президента Киргизии Жаныбек (Жаныш) Бакиев заочно приговорён Сузакским райсудом республики к пожизненному лишению свободы за грабежи и организацию вооружённых формирований, сообщил РИА Новости в среду пресс-секретарь генпрокуратуры Киргизии.

Экс-президент Киргизии Курманбек Бакиев пришедший к власти в результате "тюльпановой" революции 2005 года был свергнут в апреле 2010 и обвинен в коррупции и других преступлениях. В частности, он и его младший брат Жаныш Бакиев признаны виновными в организации убийства экс-главы президентской администрации Медета Садыркулова, руководителя института стратегических исследований Сергея Слепченко и его водителя.

Согласно приговору, именно Жаныш Бакиев организовал похищение 22 миллионов сомов (свыше полумиллиона долларов) из здания Джалал-Абадского областного управления Нацбанка Киргизии во время государственного переворота и свержения первого президента страны Аскара Акаева 24 марта 2005 года. Он также признан виновным в незаконном создании вооруженных формирований и организации массовых беспорядков в апреле 2010 года после свержения его брата Курманбека Бакиева.

После госпереворота 2010 года Курманбек и Жаныбек Бакиев нашли убежище в Минске. Власти Белоруссии отказываются выдавать их киргизскому правосудию.

БЕЛОРУСЫ НА НОВЫЙ ГОД БУДУТ ОТДЫХАТЬ ДВА ДНЯ

Правительство Беларуси приняло решение о переносе рабочих дней в 2014 году.

- В целях определения оптимального режима работы организаций страны правительством принято решение о переносе рабочих дней в 2014 году - с четверга 2 января на субботу 4 января и с понедельника 6 января на субботу 11 января, - сообщили interfax.by в пресс-службе Совета министров.

Таким образом, на Новый год выходными будут 1 и 2 января, в православное Рождество - 6 и 7 января.

Кроме того, правительство приняло решение о переносе рабочего дня со среды 30 апреля на субботу 3 мая; с пятницы 4 июля на субботу 12 июля; с пятницы 26 декабря на субботу 20 декабря.

- При этом организациям с учетом специфики производства (работы) предоставлено право осуществлять перенос рабочих дней в ином порядке в соответствии с законодательством, - отметили в пресс-службе.

ЧЁРНЫЙ ЮМОРОК

Школа. В класс входит новая учительница:

- Здравствуйте, меня зовут Марихуана Гашишовна, а теперь ответьте мне на вопрос:

- Как летают птицы?

Все хором: Косяками!!! - на лицах учеников появляется радость.


- А как ездят машины?

Все просто в непередаваемом восторге: На колесах!!!

- А что едят коровы?

Визг, переходящий в вой: Травку!!!!!!!

- Да!? Так вот: птицы - стаями, машины - по дороге, коровы - сено, а фамилия у меня Обломова.



КЛІМАВІЦКАЯ ІНФА-ПАНАРАМА

Клімавіцкі грамадска-палітычны бюлетэнь
Адказны за выпуск: Аржанцаў Сяргей Юр’евіч
Адрас: Клімавічы, вул. Леніна, д. 27а, кв.15.
Надрукавана на ўласным абсталяванні. Наклад 299 асобнікаў
Распаўсюджваецца бясплатна